© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Палітычная восень у Мінску пачынаецца 12 кастрычніка (стар. 2)
Дом, у які Беларусь не пускаюць (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар
Ігар Германчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец – рэдакцыя
газеты СВАБОДА
Наклад 90.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Пятніца, 10 кастрычніка 1997 г. № 112 Кошт свабодны

Беларускі прэзідэнт «цынічна доіць» Расію

Штогадовыя датацыіі Расіі ў беларускую эканоміку складаюць, па ацэнках дырэктара расійскага Інстытута эканамічнага аналізу Андрэя Іларыёнава, 1,5—2 млрд. долараў.

Іларыёнаў лічыць, што Лукашэнка *«цынічна доіць «старэйшага брата», нічога не даючы ўзамен».*

Эканаміст мяркуе, што значная доля «расійскіх датацый» кантралюецца «людзьмі Лукашэнкі». *«Можна не сумнявацца, што гэтыя грошы пойдуць у ход, калі Аляксандр Рыгоравіч уступіць у барацьбу за прэзідэнцтва ў Расіі»,* — сказаў А.Іларыёнаў. Паводле яго прагнозу, к 2000 году, калі ў РФ павінны адбыцца чарговыя прэзідэнцкія выбары, можа скласціся такое становішча, калі *«рэальна будуць процістаяць два кандыдаты — лідэр КПРФ Генадзь Зюганаў і цяперашні прэзідэнт Беларусі А.Лукашэнка».*

Як адзначае А.Іларыёнаў, фармальнасці, звязаныя з тым, што хоць Расія і Беларусь стварылі Саюз, але не аформілі яго ў федэрацыю, да таго часу могуць быць *«заканадаўча ліквідаваныя».*

Усе крокі А.Лукашэнкі, уключаючы справу Шарамета, А.Іларыёнаў схільны разглядаць праз прызму *«памкненняў беларускага лідэра на прэзідэнцкае месца ў маскоўскім Крамлі».*

Інтэрфакс

Шарамет сядзеў у турме разам з Лукашэнкам

Пасля 72 дзён зняволення карэспандэнт ОРТ Павел Шарамет даў інтэрв'ю карэспандэнту СВАБОДЫ

На здымку: Павел Шарамет з жонкай дома ў першыя гадзіны пасля зняволення.

— Павел, што ўсё ж адбылося з вашай здымачнай групай на беларуска-літоўскай мяжы?

— Шчыра кажучы, мы проста заблудзілі і трапілі на старую шашу Мінск—Вільня, якая і вывела нас да мяжы. На першым шчыце, да якога мы выйшлі, было напісана «Літоўская Рэспубліка». Але, як высветлілася, і гэта яшчэ была не мяжа — яна знаходзілася ў некалькіх дзесятках метраў далей. З беларускага боку ўвогуле не было ніякіх знакаў ці папераджальных надпісаў. Мы бачылі толькі напаўразбураную пліту з надпісам «Беларуская». Калісьці гэта быў знак «Беларуская ССР», але потым «ССР» адбілі. Ад гэтага месца мы выйшлі да дзеючага КПП з дапамогаю пажылога чалавека, якога паказалі ў рэпартажы. Адтуль да мяжы больш за 400 метраў.

— Вядома, што цябе затрымалі 27 ліпеня ў аэрапорце, куды ты прыляцеў з Балгарыі. Настрой, напэўна, быў добры — вярнуўся дадому. У які момант ты зразумеў, што арышт сапраўдны?

— Адзін з памежнікаў крадком ад іншых сказаў мне, што ёсць каманда мяне арыштаваць. І тады ілюзіі скончыліся, і я адчуў нешта накшталт страху. У другі раз я пачаў перажываць, што не хутка выйду з турмы, калі ў мінулы аўторак, у турэмным калідоры, пачуў па радыё заяву Лукашэнкі, што ён пачынае наводзіць у краіне парадак.

— Як ставіліся да цябе ў турме?

— Рэжым у гродзенскай турме адзін з самых жорсткіх сярод падобных установаў. У ёй сядзяць і асуджаныя, і затрыманыя на час следства. І парадкі абыходжання з першымі накладваюцца на другіх. У мяне не было ніякіх прывілеяў, акрамя аднаго — турэмныя наглядальнікі не білі мяне дубінкамі, што з іншымі здараецца часта.

— Якія ў цябе ўражанні ад знаёмства з турэмным кантынгентам?

— Галоўнае, што я зразумеў, — зняволеных не трэба баяцца. Куды большую небяспеку ўяўляюць некаторыя ахоўнікі. Адзін з іх, напрыклад, увесь час страшыў мяне электрашокерам; не сумняваюся, што аднойчы ён яго выкарыстаў бы. У мяне было некалькі даволі цікавых знаёмстваў. Аднаго разу мяне везлі на допыт у КДБ разам з польскім грамадзянінам, бізнесменам, які гандлюе з Беларуссю. Ён сцвярджаў, што нават дапамагаў дзіцячаму дому ў Гродне і вазіў нашых дзяцей на аздараўленне ў Галандыю. Яго затрымалі на мяжы па абвінавачанні ў кантрабандзе наркотыкаў, а цяпер «шыюць» яшчэ і шпіянаж, бо знайшлі ў запісной кніжцы нейкія тэлефоны нашых спецслужбаў. Паляк казаў, што яго трымалі ў карцэры, і скардзіўся на дрэнны стан здароўя.

Яшчэ адным уразлівым знаёмствам стала сустрэча з пажылым чалавекам, які прадставіўся Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам. Ён з Віцебскай вобласці, яму за 70 гадоў і ён забіў некага са сваякоў. Мне цяжка каментаваць такое супадзенне.

— З кім ты звязваў надзеі на вызваленне?

— З ОРТ, журналістамі ў Беларусі і маімі сябрамі. На літасць беларускага прэзідэнта я не спадзяваўся.

— А Ельцын?

— Так, я ўдзячны Ельцыну. У канкрэтных умовах ён абараніў канкрэтныя правы грамадзяніна Беларусі. У прынцыпе я разумеў, што мала значу для прэзідэнта Расіі, але калі даведаўся, што Лукашэнка ў чарговы раз падмануў Ельцына, не выканаўшы абяцанне мяне адпусціць, з'явілася надзея на больш жорсткую пазіцыю расійскага прэзідэнта. І яна апраўдалася.

— Кажуць, што з-за цябе нібыта пачаў развальвацца саюз паміж Беларуссю і Расіяй...

— Калі сапраўды пасварыліся Барыс Мікалаевіч з Аляксандрам Рыгоравічам, то ў гэтым вінаваты не Шарамет, а Лукашэнка. Я маўчаў два з паловай месяцы, а ўсё казаў і ўсё рабіў беларускі прэзідэнт. І за ўсё павінен несці адказнасць ён.

— Як ты для сябе тлумачыш, што ён ад цябе хоча?

— Па вялікім рахунку — гэта проста помста Аляксандра Лукашэнкі як чалавека мне, Паўлу Шарамету, журналісту, які ведаў Лукашэнку, калі ён быў простым дэпутатам, які быў да яго набліжаны ў першыя месяцы прэзідэнцтва, які публічна адмовіўся ад тых прывілеяў, што мне прапанаваў беларускі прэзідэнт, і ўказваў на ягоныя памылкі.

— Як ты ацэньваеш удзел у гэтай гісторыі другой групы ОРТ пад кіраўніцтвам Адамчука?

— Памылка, якую зрабіла група Адамчука, пагоршыла маё становішча. Што тычыцца Дзмітрыя Завадскага, яго я добра разумею. У турме вельмі цяжка супрацьстаяць ціску. Мяркую, ён стаў ахвярай падману і правакацыі. Шкада, што ў гэтым удзельнічаў карэспандэнт «Інтэрфакса» Сяргей Заяц, да якога я раней ставіўся добра. Калі б Завадскі не напісаў пісьмо прэзідэнту, мы б выйшлі з ім разам яшчэ ў той час.

(Працяг на стар. 2)

Тут лечаць дзяцей, хворых на рак

У панядзелак адбудзецца афіцыйнае адкрыццё Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі

Гэты цэнтр, які размешчаны ў Бараўлянах пад Мінскам, быў пабудаваны за кошт сродкаў, ахвяраваных аўстрыйцамі. Тут лечаць ракавыя захворванні з дапамогаю самага сучаснага абсталявання і прэпаратаў. Больш за 100 хворых дзяцей з усёй Беларусі праходзяць цяпер курс лячэння ў гэтай установе.

А.Д.

ОРТ спрабуе дамовіцца

Учора генеральны дырэктар ОРТ Ксенія Панамарова, якая прыбыла ў Мінск з нагоды вызвалення Паўла Шарамета, сустрэлася з прэзідэнтам Лукашэнкам. К.Панамарова імкнецца нармалізаваць адносіны ОРТ і беларускага кіраўніцтва, а таксама забяспечыць бесперашкодную дзейнасць мінскага бюро.

Прэзідэнт Лукашэнка заявіў на пачатку гутаркі, што вызваленне П.Шарамета з-пад варты абумоўленае ў першую чаргу просьбай Патрыярха Алексія II і Барыса Беразоўскага (якога Лукашэнка днямі называў «жулікам»). Па словах кіраўніка прэс-службы Валерыя Талкачова, прадстаўнік патрыярха двойчы прыязджаў у Мінск і прасіў Лукашэнку *«змякчыць долю Шарамета».* (Дарэчы, В.Талкачоў не ведае, ці была такая ж просьба выказана адносна «долі» Тамары Віннікавай.) Па словах кіраўніка прэс-службы, Паўла Шарамета маглі б выпусціць раней, але справу затрымлівалі *«сілавыя метады і ўмяшанне маскоўскіх палітыкаў».*

Ксенія Панамарова сказала, што з прэзідэнтам Лукашэнкам удалося дамовіцца пра часовую акрэдытацыю ў Мінску тэлежурналіста Уладзіміра Фашэнкі. Нагадаем, што У.Фашэнка, грамадзянін Расіі, быў арыштаваны беларускімі ўладамі ў жніўні, прычым абсалютна беспадстаўна. Прымяніўшы сілу, яго схапілі, нібыта для дачы паказанняў. Месяц таму міністэрства замежных справаў адмовілася яго акрэдытаваць. Па словах прэс-службы МЗС, на падставах дзеючага заканадаўства акрэдытацыя для журналістаў ОРТ спыненая на 6 месяцаў.

Учора, пасля перамоваў Панамаровай з Лукашэнкам, у МЗС яшчэ не мелі канкрэтных указанняў наконт акрэдытацыі У.Фашэнкі. Ксенія Панамарова сказала, што Шарамет *«пакуль будзе папраўляць здароўе і знаёміцца з матэрыяламі справы».* Пазіцыя ОРТ застаецца ранейшай — П.Шарамет законы не парушаў.

Дырэктар ОРТ спадзяецца на паразуменне з беларускім бокам. Яна сказала: *«Адносіны Мінска з ОРТ дастаткова складаныя. Я паспрабавала растлумачыць нашу стратэгічную пазіцыю. Здаецца, Аляксандр Рыгоравіч мяне зразумеў, паколькі ёсць праблемы, звязаныя не толькі з Шараметам, але і з перадачай тэлесігнала, канкурэнцыяй на рынку і даўгамі. Я атрымала абяцанне ад прэзідэнта, што ОРТ у Беларусі было, ёсць і будзе».*

Падобна на тое, што перад сустрэчай кіраўнікоў краін СНД у Кішынёве Лукашэнка спрабуе змякчыць свой гнеў на тэлеканал. На ўчарашнім брыфінгу ў МЗС намеснік міністра Ніна Мазай разглядала прыезд дырэктара ОРТ у рамках *«нармалізацыі дыялогу з Расіяй».* Але сама К.Панамарова падкрэсліла, што прадстаўляла інтарэсы выключна сваёй тэлекампаніі.

Прэзідэнт Лукашэнка сказаў, што *«папярэдняя інфармацыя пра К.Панамарову была негатыўная ва ўсіх адносінах».* Цяпер ён, відавочна, атрымаў «аб'ектыўнае» ўражанне. Пра гэта можна будзе меркаваць на падставе яго далейшых дзеянняў у дачыненні да ОРТ.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Дарэчы

На пасаду генеральнага дырэктара ОРТ Ксенію Панамарову рэкамендаваў сам Барыс Ельцын. Яна стала першай жанчынай на гэтым пасту за ўсю гісторыю «Астанкіна» і ОРТ.

Раней К.Панамарова працавала галоўным рэдактарам дзелавога штотыднёвіка «Коммерсантъ», а потым стала першым галоўным рэдактарам штодзённай газеты «Коммерсантъ-Daily». Праўда, ёй далі выпусціць толькі нулявы нумар гэтай газеты, у рэдакцыйным артыкуле якога, дарэчы, упершыню быў выкарыстаны тэрмін «новы рускі». Пасля сыходу з «Коммерсанта» Ксенія Панамарова пры фінансавай падтрымцы Барыса Беразоўскага стварыла і ўзначаліла каляровы эканамічны штотыднёвік «Ревизор». І вось цяпер яна стала на чале «першага СМІ Расіі» — ОРТ.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Свабодны прафсаюз выганяюць з завода

Новы дырэктар брэсцкага завода «Цветатрон» Віктар Падольскі пачаў сваю дзейнасць з рэпрэсіяў супраць арганізацыі Свабоднага прафсаюза

Спачатку, прадстаўляючы працоўнаму калектыву новага кіраўніка, генеральны дырэктар НВА «Інтэграл» (у склад гэтага аб'яднання ўваходзіць брэсцкі «Цветатрон») В.Емяльянаў заявіў, што Свабодны прафсаюз з'яўляецца незаконнай структурай, бо яго дзейнасць прыпыненая ўказам прэзідэнта. Віктар Падольскі пацвердзіў, што будзе супрацоўнічаць толькі з афіцыйным прафсаюзам, які падпісаў працоўнае пагадненне з адміністрацыяй. Падольскі даручыў свайму намесніку па рабоце з кадрамі Міхаілу Урбану, які раней узначальваў прадпрыемства і быў зняты з пасады ў выніку арганізаваных пратэстаў Свабоднага прафсаюза, на працягу некалькіх дзён выселіць заводскі прафсаюзны камітэт з памяшкання. Бухгалтэрыя завода замарозіла прафсаюзны рахунак, а старшыню Свабоднага прафсаюза Уладзіміра Малёя, які звольніўся з прадпрыемства, не пускаюць на тэрыторыю завода.

Абураныя незаконнымі дзеяннямі новай адміністрацыі, работнікі прадпрыемства падалі зварот на імя мэра Брэста з патрабаваннем спыніць рэпрэсіі супраць Свабоднага прафсаюза на заводзе «Цветатрон».

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Шарамет сядзеў у турме разам з Лукашэнкам

(Пачатак на стар. 1)

— Які будзе твой каментар да сітуацыі ў Беларусі?

— Думаю, што Беларусь знаходзіцца на мяжы самых драматычных падзеяў. У турме я адчуў, што калі ў такім тэмпе будуць развівацца падзеі, мы можам хутка апынуцца ў 37-ым годзе.

— Твая гісторыя яшчэ не завяршылася, наперадзе — суд. Што ты можаш сказаць наконт прад'яўленых табе абвінавачванняў?

— Яны ўсе надуманныя і несправядлівыя. Пераход мяжы такі ж надуманы, як і мой «удзел» у замаху на прэзідэнта, «шпіянаж» і г.д. Я не наносіў шкоды беларускай дзяржаве, гэта адназначна. Не ведаю, што будзе заўтра, сітуацыя можа змяніцца, але спадзяюся, што здаровы сэнс возьме верх над нянавісцю.

Гутарыў **Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ**

P.S. *Гэтае інтэрв'ю мы паказалі чалавеку, кампетэнтнаму ў справах нашых спецслужбаў. Расказ Паўла Шарамета аб гродзенскай турме не выклікаў у яго заўваг, але эксперт даў каментар да таго моманту інтэрв'ю, дзе ідзе гаворка аб знаёмстве з «польскім бізнесменам» і 70-гадовым «Аляксандрам Лукашэнкам». Як патлумачыла наша крыніца, паколькі КДБ не мае ў Гродна свайго ізалятара і камітэт «арандуе» некалькі камераў у гродзенскай турме, цалкам немагчыма, каб у камеру да Шарамета трапілі звычайныя крымінальнікі. На думку эксперта, чым больш натуральна выглядае расказ сукамерніка, тым больш верагодна, што ён з'яўляецца простым стукачом гэбістаў. Не выключана, такім чынам, што і дзед па прозвішчу Лукашэнка, і польскі бізнесмэн — звычайныя «падсадныя вуткі», якія мелі заданне выцягнуць з Паўла неабходную следству аператыўную інфармацыю ці справакаваць яго на выказванні, якія потым могуць яму дорага каштаваць.*

Напярэдадні акцыі

Палітычная восень у Мінску пачынаецца 12 кастрычніка

Якое надвор'е яна прынясе? Будзе на вуліцах горача ці холадна? Будуць кадравыя ападкі ці масавыя пасадкі? Гэтыя пытанні мы абмяркоўваем з Лявонам БАРШЧЭЎСКІМ, адным з лідэраў Беларускага народнага фронту — арганізацыі, якая заявіла аб падтрымцы шэсця, што пачнецца ў гэтую нядзелю аб 11 гадзіне ля метро «Трактарны завод».

— Якім чынам Народны фронт збіраецца падтрымаць пратэст людзей супраць голаду і холаду?

— Мы будзем імкнуцца надаць гэтай народнай імпрэзе відовішчны і запамінальны характар. Будуць там і арыштанты ў робах — з ліку тых, што паспелі за свае палітычныя перакананні адседзець у турмах дыктатарскага рэжыму. А адну паласатую робу трэба, відаць, уручыць Самаму Галоўнаму — каб апрануў яе беларускаму карупцыянеру нумар адзін.

— Вы лічыце, што ў Беларусі сёння ўсталяваўся дыктатарскі рэжым. Але ж ніводная партыя не забароненая, вы ўсё лета хадзілі на дэманстрацыі, і нікога ж не застрэлілі!

— Проста рэжым, маючы за спінай 200 тысяч узброеных людзей, упэўнены, што яны яго ў любым выпадку абароняць. Таму пакуль што і не страляюць... Але ж пад судом і Шарамет, і Завадскі, і Шыдлоўскі з Лабковічам, гэтыя амаль што дзеці. Увогуле, за надпісы на сценах садзілі апошні раз, здаецца, толькі пры Гітлеры.

— І як з усім гэтым змагацца?

— Ёсць зброя мацнейшая за кулі і дубінкі — смех! Дыктатары больш за ўсё баяцца смеху. Успомнім, як міліцыя хацела вылавіць лялькаводаў, што паказвалі «Цара Аляксашку» сёлета ўвесну каля Опернага тэатра. Цяперашняя акцыя пройдзе не ў цэнтры Мінска, з чым ужо ўсе звыкліся. Гэтым разам мы пойдзем па «пралетарскім» раёне і запросім да ўдзелу ў шэсці яго жыхароў. А жыхары гэтыя, наколькі мне вядома, даўно збіраюцца перадаць пэўныя падарункі самаму высокаму ўладару.

— Цікава, што гэта за падарункі?

— Ну, напрыклад, рыдлёўкі з адмысловымі надпісамі накшталт «рыдлёўка прэзідэнцкая». Таксама прэзідэнту могуць падарыць ватоўку. Вопратка нязручная для «мерседэса», але незаменная ў сапраўднай працы. Глядзіш, калі адрасат прыслухаецца ды сапраўды вернецца дадому, дык цаны ёй не будзе — гэтая ватоўка стане нацыянальным рарытэтам. І дубальтоўку людзі збіраюцца ўручыць — каб ворагаў пужаў... а то развялося іх столькі, што жыццё не толькі што ніжэй калена апусцілі, а ўжо яго, не раўнуючы, па зямлі валакуць. Дарэчы, і певень, ажно са Шклова, хоча таксама прайсціся з намі. З пёрамі дзіўнымі, як у паўліна. А на пёрах надпісы: «абяшчаю», «здзелаю», «чэсны»...

— А што вы хочаце сказаць тым, хто пажадае прыйсці на шэсце ды мітынг?

— Хачу папрасіць, каб узялі з сабой аловак ці ручку. Бо каб нашыя словы не засталіся толькі паветрам, кожны на тых дарах зможа паставіць свой аўтограф. А галоўнае — гэта не забыць дома ўсмешку. А хто забудзе, той яе набудзе ў нас. І прынясе тады дадому добры настрой. Прынамсі, аптымістычны...

Гутарыў **Уладзімір ЛОГДА**

Праект дэкрэта не ўсім даспадобы

Гродзенская вертыкаль рапартуе, што абмеркаванне праекта прэзідэнцкага дэкрэта пра парадак і дысцыпліну адбылося ў вобласці на высокім узроўні і што працоўныя падтрымалі Лукашэнку.

Аднак гэта агульныя словы, а ў сапраўднасці многія працоўныя калектывы асудзілі асноўныя палажэнні дэкрэта. Напрыклад, у Зэльвенскім раёне на сходах выказвалася патрабаванне зменшыць усе штрафы, прапанаваныя Лукашэнкам, у 10 разоў. Адзін з кіраўнікоў падаткавай службы Ашмянскага раёна заявіў, што запісаныя ў дэкрэце штрафы памерам ад 6 да 60 млн. рублёў астранамічныя, і ніхто не зможа іх сплочваць. Нават штрафы ад 2 да 20 мільёнаў, якімі караюць за розныя падаткавыя парушэнні, вельмі цяжка спагнаць, бо ў людзей няма грошай, сказаў ён. Атрымліваецца, што Лукашэнка слаба арыентуецца ў тым, якія заробкі ў грамадзянаў РБ.

У Слоніме людзі гаварылі пра тое, што пункт аб пакараннях за спазненне на працу ўвогуле трэба скасаваць, бо з-за таго, што транспарт працуе ненадзейна, спазніцца на працу можа кожны. Адзін рабочы са Слоніма задаў рытарычнае пытанне: народ, маўляў, гарой стаяў за прэзідэнта, дык ці трэба «закручваць гайкі» і тым самым выклікаць азлобленасць людзей?

Негатыўную рэакцыю прэзідэнцкі дэкрэт выклікаў шмат у каго на самым буйным прадпрыемстве вобласці — гродзенскім аб'яднанні «Азот». Дэкрэт Лукашэнкі асудзілі і ўдзельнікі сходу ў Лідскім лакаматыўным дэпо. На сходах у арганізацыях, дзе большасць складае інтэлігенцыя, адзначаліся дыктатарскія замашкі Лукашэнкі, парушэнне дэкрэтам канстытуцыйных нормаў і КЗАПа, ігнараванне ролі прафсаюзаў.

Большую падтрымку выказалі прэзідэнцкаму дэкрэту старшыні калгасаў. Напрыклад, старшыня калгаса «Світанне» Мастоўскага раёна М.Жывушка патлумачыў, для чага патрэбны дысцыпліна і парадак, наступным чынам. Па яго словах, за апошнія два гады з калгаса «Світанне» былі выключаны 22 працаздольныя работнікі, якія аказаліся п'яніцамі і злодзеямі. М.Жывушка ўдакладніў пры гэтым, што *«у свой час з Расіі да нас у калгас пераехалі дзесяць сем'яў. Сёння ў нас з іх працуе толькі адна жанчына, з астатнімі вымушаны былі развітацца»*.

Найбольш падтрымалі Лукашэнку пенсіянеры, якім ужо не трэба хадзіць на працу. Яны хвалілі прэзідэнта за тое, што ён дзейнічае *«як Сталін і Андропаў»*.

Сяргей МАКСІМОВІЧ

Удакладненне

У інфармацыі «Маладыя ваўкі крымінальнага свету», апублікаванай у СВАБОДЗЕ 19 верасня, карэспандэнт газеты недакладна пераказаў словы начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення камітэта па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю Міхаіла Варанкова. Цытуем дакладнае выказванне М.Варанкова: *«Гарантии, что среди абитуриентов и выпускников школы милиции нет агентов уголовного мира, я дать не могу»*.

НАЗІРАННІ

Дадумаліся!..

Грамадзяне Саюза

У Беларусі пастаянна пражываюць грамадзяне іншых дзяржаваў, або асобы без грамадзянства. Усе яны ў органах МУС атрымоўваюць часовы від на жыхарства.

Час ад часу гэты дазвол трэба аднаўляць. Але тыя грамадзяне Расіі, якія ў гэтыя дні прыходзяць у адпаведныя органы для прадаўжэння тэрміну пражывання ў Беларусі, выходзяць адтуль вельмі ўражанымі. Ім замест віда на жыхарства выдаецца пажыццёвы дазвол на пражыванне як грамадзянам Саюза Беларусі і Расіі.

Многія гэтаму радыя, іншыя, якім не хочацца быць саюзнымі грамадзянамі, радуюцца не вельмі. Мы ж толькі здзіўляемся, бо ніякіх законаў аб падвойным грамадзянстве ні ў нас, ні ў Расіі пакуль няма. Можа, і дарэмна здзіўляемся, бо бязглуздзіца — рэч для сучаснай Беларусі звычайная, а нешта разумнае — рэдкасць. Таму са здзіўленнем лепш пачакаць.

Змена шыльды

Сёння аэрапорт «Мінск-2», які разлічаны на абслугоўванне 6 мільёнаў пасажыраў у год, выкарыстоўваецца толькі на 1/10 сваёй патэнцыйнай магутнасці.

Як вядома, гэтую паветраную гавань плануецца ўключыць у свабодную эканамічную зону «Мінск», і, мусіць, тады сюды хлынуць грошы замежных інвестараў. Аднак ужо цяпер на падтрымку гэтага прадпрыемства ў рабочым стане патрэбны мільёны і мільёны ў валюце.

Урад нешта абяцае авіятарам, але раіць і самім зарабляць. А пакуль у якасці аператыўнай меры прапануецца перайменаваць «Мінск-2» у «Машэраўскі». Як кажуць: без каментарыяў.

Эканамічны натуралізм

У гаспадарках Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці зарплату часцяком выдаюць натурай.

Ясна, што гэта таксама выйсце. Але ж селяніну патрэбнае не толькі зерне, або нават мяса ці гной на соткі. Патрэбныя і вопратка, і многае іншае, чаго ў калгасе не выпрабляюць і што трэба купляць за грошы. Канешне, адносіны паміж калгасамі і калгаснікамі патрыярхальныя, але ж і такі натуралізм павінен мець межы. Інакш калгасам давядзецца друкаваць уласныя грошы.

Генетыка селяніна

У Крупскім раёне Мінскай вобласці крэдыторская запазычанасць калгасаў і саўгасаў дасягнула 125 млрд. рублёў, або ў сярэднім па 5 мільярдаў на гаспадарку.

Калі яны аддадуць даўгі — гэта не пытанне. Ніколі! На думку першага намесніка старшыні Крупскага райвыканкама М. Хацкевіча, выйсце адно: трэба пачынаць рэформы сельскай гаспадаркі. Тым больш, што пасля апошніх заяваў прэзідэнта краіны аб спыненні падтрымкі неэфектыўных гаспадарак няма на каго спісваць сваю ўласную баязлівасць перад пераўтварэннямі.

Але ж у нас так не бывае, каб не было на каго спісваць 'уласныя грахі. Таму таварыш Хацкевіч засяроджвае ўвагу на генетыцы селяніна: маўляў, для змены яе патрабуецца шмат часу. Дарэчы, генетыка — гэта навука аб законах спадчыннасці і зменлівасці жывых арганізмаў і метадах кіравання імі. А генетыка ў нашага селяніна простая: некалькі пакаленняў запар улада адбірала ў яго ўсё і не давала ўзамен нічога. І каб яе (генетыку) змяніць, трэба адмовіцца ад здзеклівай хлусні пра калгасны лад і аддаць селяніну тое, што належыць ад Бога — зямлю.

Пасля гэтага можна паразважаць і наконт генетыкі.

У Жыткавічах размяркоўваюць «кандыдатаў у нябожчыкі»

На жаль, людзі старэюць і паміраюць. А на пахаванне патрэбныя грошы, якія не заўсёды ёсць.

Таму пасля смерці многія нябожчыкі становяцца «нічыйнымі». Гэтую праблему паднялі ў Жыткавічах, дзе старшыня райвыканкама А. Сцепаненка сустрэўся з членамі прэзідыума ветэранскіх арганізацый.

Рэч у тым, што за апошні час зліквідаваны многія ўстановы, дзе чалавек раней працаваў і як бы лічыўся «на балансе». Цяпер няма ні самой канторы, ні таго балансу. Выйсце бачаць у тым, каб замацоўваць «кандыдатаў у нябожчыкі» за моцнымі ў фінансавых адносінах прадпрыемствамі. Вось такія справы.

Кастусь ГАРБУЗ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Беларусь и Чечня: параллели судеб

Белорусы и чеченцы во многом не похожи друг на друга. Мы — христиане, они — мусульмане. Мы — «памяркоўныя», они — «горячие». Но все-таки в судьбах наших народов было и есть нечто общее...

Сколько бы ни трубила официальная пропаганда, что белорусы и русские — единый народ, который всю жизнь прожил вместе, но факты истории свидетельствуют о другом. Наши предки со времен Полоцкого княжества или соперничали друг с другом, или находились в открытой вражде. На Кавказе также не одну сотню лет шла война, в которой свободолюбивые горцы сражались против русских солдат, отстаивая свою независимость. Но в конце концов случилось так, что и белорусы, и чеченцы стали подданными Российской империи...

Изменения наметились после октябрьского переворота. Большевики, придя к власти, объявили о праве каждой нации на самоопределение. Этим правом поспешили воспользоваться многие народы. Финны, эстонцы, латыши, поляки, литовцы — кто в борьбе, а кто мирным путем — сумели создать независимые от России государства. Но многим нациям и народам в этом было отказано — для большевиков самоопределение имело свои пределы. В разряд тех, кого вынудили остаться в уже новой империи, которая получила название СССР, попали и белорусы. Хотя, надо признать, нам повезло больше, чем тем же чеченцам. БССР была объявлена самостоятельной республикой, имевшей в Союзе равные права с другими республиками. Чеченцы не имели даже этого — Чечено-Ингушская АССР входила в состав РСФСР на правах автономии. Решение, какую республику считать равноправной России, а какую входящей в ее состав, большевики принимали по своему разумению, мало заботясь о мнении самого народа. О том, что в будущем это может привести к кровопролитию, они не думали.

1994 год стал особым как для белорусского, так и для чеченского народов. В Беларуси в этом году прошли выборы первого президента. На этот пост был избран человек, который обещал бороться с коррупцией, компенсировать обесцененные инфляцией вклады, запустить до нового года заводы, освободить прессу от государственного контроля и многое другое. При этом президент грозился покинуть через два года свой пост, если хоть одно из обещаний не будет выполнено. С этого времени государство стало сдавать свой суверенитет Кремлю, теряя при этом авторитет на международной арене.

В Чечню в конце 1994 года вошли российские войска для наведения там «конституционного порядка». То, что чеченский народ не принимал участия в голосовании за эту конституцию, в расчет не принималось. Встреча Нового 1995 года проходила в Грозном под автоматные очереди и залпы орудий. А как говорят в народе: как Новый год встретишь, так его и проведешь. Весь год в Чечне шла война, прерываемая на короткое время переговорами. Иногда военные действия перемещались на территорию самой России — Буденновск, Первомайск. Тысячи убитых и раненых, не только среди военных, но и среди гражданского населения — вот итог этой бессмысленной войны.

Беларусь прожила этот год более спокойно. Проведенный в мае референдум поставил под сомнение усилия по возрождению белорусского языка, а национальную символику заменил на советскую с небольшими косметическими изменениями. Тех же депутатов, которые были не согласны с самой постановкой этих вопросов, избили дубинками, доказав тем самым, что понятие «неприкосновенность» стало прерогативой только одного человека в нашей стране.

2 апреля 1996 года белорусский и российский президенты подписывают договор о создании Сообщества двух государств. В Минске в это время проходят демонстрации людей, не согласных с политикой руководства страны. Власти отвечают на эти выступления одним проверенным средством — дубинками.

Вынужден покинуть Беларусь лидер БНФ Зенон Пазьняк, найдя политическое убежище в США.

Чеченский народ тоже теряет своего лидера борьбы за национальную независимость. Погибает Джохар Дудаев — первый президент Чеченской республики Ичкерия. Летом 1996 года война в Чечне заканчивается. Москва и Грозный начинают переговоры о выводе российских военных формирований с территории республики. Осенью того же года российское руководство своим посредничеством в переговорах между парламентом и президентом Республики Беларусь помогла последнему узурпировать всю власть в стране.

В 1997 году Россия и Беларусь подписали договор о Союзе двух государств, из которого следует, что наша страна теряет часть суверенитета, а наш президент продвигается еще на один шаг к «завоеванию» Кремля.

...Белорусский и чеченский народы, хотя и разные по своей вере, культуре, традициям, менталитету, но находятся сегодня в одинаково «подвешенном» состоянии. Беларусь, являясь независимым государством, признанным во всем мире, с каждым подписанием нового договора с Россией теряет часть своего суверенитета. И если ежегодные подписания договоров продолжатся, то года через три-четыре наше государство рискует незаметно для собственного народа превратиться в один из субъектов Российской Федерации.

Чечня же в свою очередь, фактически завоевав независимость, никак не может оформить ее юридически. Ичкерия по-прежнему стремится к установлению с Москвой дипломатических отношений, Москва же, в свою очередь, считает Чечню неотъемлемой частью России. Скорее всего, между Москвой и Грозным установятся такие же отношения, как между Китаем и Тайванем: де-юре практически все государства признают Тайвань неотъемлемой частью КНР, но дефакто все понимают, что остров уже давно не принадлежит Пекину.

Дмитрий АНТИПЕНКО,
г. Минск

Праўвася на «алімп»

Дазвольце праз вашу газету выказаць удзячнасць прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку, прэм'ер-міністру Сяргею Лінгу, міністру адукацыі Васілю Стражаву за тое, што мая сям'я, нарэшце, трапіла ў статус малазабяспечаных і будзе атрымліваць 50% дапамогі на дзяцей. Я са зразумелым хваляваннем узгадваю, што пры шэльмах-камуністах усе мае спробы прабіцца ў бядняцкі статус натыкаліся на непераадольны класавы бар'ер у 51 капейку: пры ўсіх разліках душавы даход маёй сям'і быў 50 руб. 50 кап., што на 51 капейку было вышэй дазволенага.

Асобая падзяка старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Уладзіміру Ганчарыку і старшыні настаўніцкага прафсаюза Чобатавай. Менавіта іх нястомныя словы дбання пра дабрабыт працоўных дазволілі гэты несумненны прарыў.

Тым жа з калегаў, хто пакуль што не дасягнуў такога зайздроснага статуса, раю не адчайвацца: дабрабыт не за пагоркамі. Пацярпіце, як цярпіце дагэтуль.

З павагаю

Мікола БУСЕЛ,
настаўнік вышэйшай катэгорыі з 24-гадовым стажам (жонка — настаўніца I катэгорыі з 20-гадовым стажам)

Когда усиливается классовая борьба...

Согласно нашей официальной статистике, дела в экономике республики улучшаются. Почему же мы, отдельные граждане, не чувствуют улучшения своей жизни?

Власти заготовили свои варианты ответов на такие вопросы и вину за свою бездарную экономическую политику решили переложить на «козлов отпущения». На этот раз такими козлами отпущения стали руководители предприятий. Они обвинены в том, что якобы не выполняют мудрые указания сверху, не хотят «запускать заводы», не продают продукцию, да еще и увеличивают цены. Короче, враги и саботажники найдены. Правда, нигде не упоминается о «добровольном» перечислении денег предприятий на проведение референдума и различные пышные торжества. Бесконечные проверки различных контрольных органов тоже, мягко говоря, не способствуют улучшению работы, а каждая новая регистрация и перерегистрация ведет к постепенному уничтожению предпринимателей как класса.

Во всем мире директорский корпус всегда имеет огромное влияние на правительство. Но наша страна, как известно, не собирается идти за цивилизованным миром. Суд над Семеновым в Могилеве, Тарановым в Бобруйске и Кудиновым в Борисове — самые яркие примеры уголовного преследования директорского корпуса. Причем не спасает ни политическая лояльность, ни личная преданность. Пример — судьба Тамары Винниковой.

Как говорил известный классик марксизма-ленинизма товарищ Сталин, по мере развития социализма классовая борьба усиливается. Мы строим хоть и рыночный, но социализм. Теперь вслед за директорским корпусом может появиться и другой вражеский класс. Например, за состояние здоровья населения можно привлечь к ответственности группу врачей-вредителей. Примеров поиска врагов в истории предостаточно. Существует и такая закономерность: чем хуже идут дела в стране, тем больше появляется врагов.

Призрак 37-го года бродит по Беларуси. Тогда многие тоже думали: если я не виновен, то меня не арестуют. Чем это кончилось — известно.

Владимир МИХЕЕВ,
г. Минск

Стыдно за таких учителей

Уважаемая редакция! Хочу высказать свое возмущение тем, что произошло на съезде учителей во время выступления Лукашенко. После циничного заявления президента о том, что Павел Шеремет сам отказался от адвокатов и якобы не хочет выходить из тюрьмы, в зале раздался смех и аплодисменты. Какое кощунство! И эти люди называют себя цветом учительства. До какого же холуйства довел этот режим людей, если те, кто всегда проявляли уважение к человеку, протягивали руку помощи нуждающимся, так похамски поступили по отношению к журналисту, которого упрятали за решетку только за то, что он показывал правду. Стыдно за таких учителей.

Да, жизнь и нищенская зарплата учителей не выдерживают никакой критики. Но нельзя же из-за брошенного куска хлеба с колбасой с барского стола так пресмыкаться перед барином. Ведь этой подачки, которую бросил президент учителям в виде разовой помощи в размере около минимальной зарплаты, хватит всего на килограмм колбасы. Вот как дешево можно купить голодных людей и манипулировать их сознанием!

А почему на съезде никто не спросил президента о том, из-за чего Беларусь уступает только Таджикистану среди государств СНГ по уровню инфляции, которая у нас за 7 месяцев этого года превышает показатели России — в 5 раз, Украины — в 8 раз, Казахстана — в 7 раз и т.д. Эти показатели опубликованы в правительственной газете «Рэспубліка» за 1 октября 1997 г.

Вот какую цену платит народ Беларуси за «мудрую политику» Лукашенко. А если взять уровень инфляции за сентябрь, который еще не объявлен, но который уже все ощутили на себе, то я думаю, что здесь Беларусь даже обогнала воюющий Таджикистан. Вдумайтесь в эти цифры! Да, голодную и нищую страну легко превратить в коммунистическую Вандею и продолжать сколь угодно долго издеваться над собственным народом, посылать приветствия коммунистическим съездам и финансировать за счет народа БПСМ, ставить новые коммунистические эксперименты и призывать к борьбе с «жуликами и финансовыми воротилами». Но ведь все это уже было в нашей истории. Неужели люди забыли миллионы жертв коммунистического режима, искалеченные судьбы и душу народа?

Люди, очнитесь от дурмана лжи и цинизма, которым вас продолжают усыплять. Подумайте о будущем своих детей. Посмотрите вокруг.

С уважением

И.Л-вич,
учитель, г. Гомель

P.S. Подписываюсь так, потому что не хочу навлечь на себя и семью бед. Слишком хорошо знаю режим. Полный адрес сообщаю только для сведения редакции.

Обманываем самих себя

Уважаемая редакция, я давно выписываю вашу газету и убедилась в том, что это самая правдивая газета. В ней всегда пишут правду. И поэтому я хочу, чтобы вы напечатали мое письмо — чтобы люди знали правду о том, что творится в нашей республике.

По телевидению у нас всё прекрасно, везде порядок и благополучие, а на самом деле всё наоборот. Я приехала в д.Михалево Бобруйского р-на Могилевской обл. на пару дней погостить. И что я увидела: до сегодняшнего дня (письмо датировано 29 сентября. — ***Ред.***) стоит нескошенная пшеница, колосья поникли к земле. А председателю колхоза, видимо, до лампочки, что уже конец сентября — давно отпраздновали «дожинки». Кругом бесхозяйственность и очковтирательство. До каких пор мы будем сами себя обманывать?

Анастасия ЛУКАШЕВА,
г. Бобруйск

АНТИКОРРОЗИЙНЫЕ МАСТИКИ TECTYL — АМЕРИКАНСКОЕ КАЧЕСТВО, ДОСТУПНОЕ ВСЕМ ЖЕЛАЮЩИМ

Вы, конечно, уже слышали, что для продления срока службы Вашего авто необходима соответствующая обработка днища и других уязвимых мест. Но не спешите прислушиваться к мнению соседа-дилетанта — в отличие от его «опыта» научное исследование, проведенное по заказу авторитетного финского издания «Tyuuli Lasi» независимой лабараторией, намного объективнее.

Какой же состав был признан лучшим из представленных аналогов? Это мастики TECTYL, производимые по технологии американской фирмы VALVOLINE — они уже успели снискать себе славу не только в обычных, но и в неординарных ситуациях. Поэтому неудивительно, что TECTYL избран в качестве заводского покрытия такими гигантами автомобилестроения, как «Форд», «Крайслер» и «Рено».

Проникая во всевозможные мелкие трещины и полости, обволакивая сварочные швы и другие уязвимые места на корпусе, мастика фирмы VALVOLINE в течение 5 лет гарантированно избавит Вас от ржавеющего днища или прогнивших дверей. Кроме того, TECTYL дает хорошую защиту от механических повреждений, а также повышает шумоизоляцию салона.

У нас, в Беларуси, недавно открылась станция официального дилера VALVOLINE фирмы «АРЛЮСАРО». Здесь всего за 2,5–3 часа проведут весь процесс обработки, по желанию клиента могут еще вставить в арки колес защитные подкрылки. Здесь будут рады любым автотранспортным средствам массой до 2,5 тонн. Сразу же после окончания обработки Вы сможете забрать свою машину, но еще пару дней ее не рекомендуется интенсивно эксплуатировать — в мастике окончательно завершается процесс полимеризации.

Итак, если Вы хотите значительно увеличить срок службы своего автомобиля, записывайтесь на антикоррозийную обработку на фирме «АРЛЮСАРО».

Адрес: г.Минск, Промышленная зона «Шабаны», Промышленный пер., 9, тел.: (017) 244-32-02, 270-04-85.

Семен МАРКОВ, РИА «АПАШ»

ДЛЯ НАВУКОЎЦАЎ, ДАСЛЕДЧЫКАЎ, ЭКСПЕРЫМЕНТАТАРАЎ!

Урад Злучаных Штатаў Амерыкі абвяшчае адкрыты конкурс на атрыманне стыпендыяў па праграмах **Regional Scholar Exchange Program** і **Freedom Support Act Fellowship in Contemporary Issues**

Абедзве праграмы каардынуе Савет па міжнародных даследаваннях і абменах (IREX). Амерыканскі ўрад бярэ на сябе ўсе арганізацыйныя клопаты і выдаткі стыпендыятаў.

УВАГА: заяўку можна падаваць толькі на адну з праграм. У конкурсе могуць браць удзел асобы ва ўзросце ад 25 да 55 гадоў на момант падачы заяўкі, якія вольна валодаюць англійскай вуснай і пісьмовай мовай, могуць давесці неабходнасць даследчыцкай дзейнасці ў Амерыцы і з сакавіка 1996 года не ўдзельнічалі ні ў якай іншай навуковай праграме, што фінансавалася ўрадам ЗША.

Тэрмін падачы заявак — да 31 кастрычніка 1997 года.

УСЮ ІНФАРМАЦЫЮ МОЖНА АТРЫМАЦЬ У ПРАДСТАЎНІЦТВАХ:

IREX
220005 Мінск а/с 90
e-mail: taisa@open.minsk.by
Тэл./факс 227 15 72

Інфармацыйны цэнтр USIS-ACCELS па пытаннях адукацыі
Мінск, вул. Сурганава 15-11
Фундаментальная бібліятэка Акадэміі навук
Тэл./факс 262 88 88

ПРЭТЭНДЭНТЫ НА ЎДЗЕЛ У ПРАГРАМАХ ПАВІННЫ:

— быць выкладчыкамі ВНУ, навукоўцамі-гуманітарыямі, якія дагэтуль не мелі магчымасці займацца навуковай дзейнасцю ў ЗША;
— мець навуковую ступень кандыдата (доктара) навук або рыхтавацца да атрымання такой ступені;
— мець адпаведныя навуковыя публікацыі;

ЗАЯЎКІ ПАДАЮЦЦА НА ДАСЛЕДАВАННЕ ПА АДНОЙ З ДЫСЦЫПЛІН:

Regional Scholar Excange Program
American Studies; Business Administration; City Planning and Urban Studies; Civic Education; Conflict Resolution; Journalism; Economy (incl. Trade, Finance and Investments); Management and Marketing; Demography, History, Education; Law; Criminal Justice; Ethics and Philosophy; Foreign Policy and International Relations; International Economics; Government; Industrial Labour Relations; Political Science; Public Administration; Sociology; Social Work; Library and Inforamation Science; Womens Studies; Teaching English as a Foreign Language
Пачатак даследаванняў у жніўні 1998 года

Freedom Support Act Fellowship in Contemporary Issues
Актуальныя пытанні сучаснай гісторыі СНД:
Sustainable Growth and Development of NIS Economies in Transition; Democratization, Human Rights, and the Rule of Law; Political, Military, Security and Public Policy Issues; Strengthening Civil Society; Communication Revolution and Access to Information
Пачатак даследаванняў у сакавіку 1998 года

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
10 кастрычніка 1997 г., № 112

Два арбуза под мышкой

Людмила ГРЯЗНОВА

Художественная культура еще со времен эпохи Возрождения развивает традицию возвышения и даже обожествления женщины. Так в книгах, так на полотнах художников, так в кино. В искусстве.

В реальной жизни свои законы. Но в нашем обществе разделение на мужчин и женщин явно переходит границы здравого смысла. И прежде всего — в сфере трудовых отношений.

Домашняя хозяйка

Давно сложился и еще достаточно живуч социально-психологический стереотип: женщина — хозяйка дома, а мужчина — кормилец семьи. Однако административная экономика сильно поколебала право мужчины называться кормильцем. Низкая заработная плата не позволяла мужчине подняться до такого статуса и обеспечивать семью. Традиционная женская роль не только не поколебалась, но и укрепилась. Женщина, несмотря ни на что, осталась на своем пьедестале и сохранила неограниченную власть и ответственность в пределах кухни.

Пределы кухни оказались столь масштабными, что посрамили большую экономику. Дома женщины (даже в городе, не говоря уже о деревне) затрачивали больше труда, чем на стройках коммунизма. Не думаю, что сегодня положение кардинально изменилось. Сфера домашнего труда огромна и огромны здесь затраты хозяек. Участие мужчин в домашнем труде существенно ниже.

Патриархальные традиции удерживают женщину у плиты, отводят ей роль *хранительницы домашнего очага*, считают ее воспитательницей детей, отдают ей функции *прачки*, *уборщицы* и т.д. Все эти занятия обыденное общественное мнение почему-то считает «немужским» делом. Женщина, привязанная нитями стереотипов к плите, буквально приковывается к этому месту цепью административной экономики. Финансируя военно-промышленный комплекс, советские руководители забыли о картошке, кофточках и домашней бытовой технике. Домашняя хозяйка приспособилась. Она — выращивала картошку на приусадебном участке, вязала кофточки, стирала белье, как это делала ее бабушка.

Нынешние вожди, разрушающие естественную рыночную среду, доводят заработок до такого уровня, что жить на него невозможно. Перекрывая канал предпринимательства, дающего всем — и хозяевам, и работникам — человеческие доходы, власть фактически оставляет только одну возможность выживания — домашнее хозяйство. Здесь и сегодня производится все, что *недоступно, но крайне необходимо* для жизни семьи: домашние хозяйки выращивают картофель, вяжут кофточки, вручную стирают белье, с завистью посматривая за светской жизнью героинь мексиканских телесериалов.

Советская экономическая система, последствия которой ощущаются до сих пор и которую кое-кто хочет восстановить, питается не только деньгами нефтегазового комплекса, но и лежит на мягкой подстилке домашнего труда. Не будь таких огромных затрат в домашних хозяйствах — не сохранялась бы относительная социальная стабильность тоталитарного общества. Неэффективная административная экономика, где каждый игрок перекладывает ответственность на другого игрока, живет, поскольку находится крайний игрок — домашние хозяйки, эффективно хозяйствующие и ни на кого не перебрасывающие свою ответственность за дом и семью.

Не случайно и праздник 8 Марта у нас превращен из семейного в государственный — чего нет ни в Европе, ни в Америке. Советское и нынешнее почти советское руководство прекрасно понимает роль женщин в домашнем хозяйстве, служащем мягкой подушечкой для экономики. Поэтому и глава государства произносит новогодний тост — «за жэншчын».

Учительница или кассирша

Домашний труд не только измождает в семье. Из-за этого женщины расплачиваются и на работе — на предприятиях, в фирмах, учреждениях. Плата немалая и чувствительная, она выражается во многом: в неравных возможностях с мужчинами в выборе сферы деятельности и профессии, в продвижении по службе, при найме и увольнении, в оплате труда и доходах.

Не странно ли, что так много женщин трудится **в сфере различных услуг** — образовании, здравоохранении, культуре, розничной торговле, общественном питании? Почему эти отрасли, как магнит, притягивают женскую рабочую силу? Причины две. Здесь больше рабочих мест, рассчитанных на *неполный рабочий день* (или не каждый). Такие рабочие места устраивают женщин из-за груза домашних забот. А также *здесь меньше платят*: мужчины сюда не очень стремятся, оставляя данную сферу для женщин. Вот и получается, что другие, более выгодные отрасли — промышленность, транспорт, банковское дело — становятся все более закрытыми для женщин.

Подобное неравенство наблюдается и между *государственным* и *частным* сектором. На государственных предприятиях больше женщин, а в частных фирмах — мужчин. Выигрывает борьбу не только тот, кто *более умелый*, но тот, кто *не обременен* домашними обязанностями.

О продвижении женщин по службе и их карьере в политике сказано немало. Очень острая тема: общество теряет от недоиспользования возможностей половины своих членов. Конечно, не все трудоспособные женщины имеют карьерные амбиции. Но многие жаждут быть замеченными, продвинуться по службе, выиграть в оплате труда — и ничего этого не получают только потому, что носят юбку, а не брюки. Самую сильную дискриминацию в сфере занятости испытывают именно те женщины, которые стремятся делать карьеру.

Вход и выход рынка труда — освещены разными световыми сигналами для женщин. Над входом все чаще зажигается красный свет. Сегодняшняя экономика — как человек, обожравшийся вчера, — сегодня ничего не хочет есть и переваривать. Спрос на все ресурсы, в том числе трудовые, резко и ненормально снижен. Кого выставляют за ворота в первую очередь? Естественно, женщину. Они первыми увольняются и последними нанимаются.

Два арбуза под мышкой

И все-таки главная боль для женщин — не дискриминация в сфере оплачиваемой занятости, не огромный труд в домашних хозяйствах сами по себе, а «двойное бремя»: занятость на работе и дома, поглощающая все время и все жизненные силы. Именно феномен «двойного бремени» позволяет говорить об особом статусе женщин в административной экономике. Нести груз двойных обязанностей так же неудобно, как нести под мышкой два больших арбуза. Долго не пронесешь — один либо другой обязательно упадет. Невозможно сочетать в полном объеме домашний и профессиональный труд: страдает либо то, либо другое. Но больше всего страдает сама женщина, не испытывающая удовлетворения от результатов своей работы.

Снять боль возможно. Надо дать шанс женщине нести под мышкой один арбуз — выполнять либо домашние, либо профессиональные обязанности. Если она желает — надо дать шанс женщине нести два арбуза, но небольших и положенных в сеточку, т.е. сочетать в разумных пределах домашний и профессиональный труд. Эти, на первый взгляд, простые решения требуют сложных изменений в экономике, политике и культуре.

Если женщина сознательно выбирает один арбуз — **груз домашнего хозяйства**, — то ее экономический выбор должен быть обеспечен. Во-первых, заработной платой мужа, достаточной для содержания семьи. (До сих пор доминирует модель семьи с двумя кормильцами: неэффективная экономика обусловливает неэффективную зарплату.) Таким образом, необходим совершенно иной уровень и характер экономических отношений, нужен реальный прогресс в экономической реформе. Во-вторых, данный экономический выбор для женщины с детьми, не имеющей мужа, должен быть обеспечен социальными пособиями, что возможно при богатом государственном бюджете экономически развитой страны.

Если женщина хочет нести в сеточке два небольших арбуза, т.е. **сочетать домашние и профессиональные обязанности**, то такой выбор должен гарантироваться развитой инфраструктурой обслуживания домашних хозяйств и гибкостью рынка труда. Сочетание двух видов труда возможно при сокращении затрат времени на домашний и профессиональный труд. Домашний труд женщин уменьшится, если он равномерно *перераспределится между мужем и женой* (впрочем, это весьма тяжелая, скорее психологическая, нежели экономическая проблема, связанная с ломкой патриархальных традиций), если он будет *облегчен за счет механизации* (а средств бытовой техники существует достаточно — была бы покупательская способность). Затраты времени на профессиональный труд уменьшатся, если рынок труда станет более гибким, появится больше возможностей для *частичной занятости*, что требует не только большей экономической свободы для предприятий и фирм, но и изменения *налогообложения и социального обеспечения*. Налогообложение пока построено таким образом, что предприятия не заинтересованы набирать больше работников (больше работников — больше размер самых разных налогов). Необходимо так трансформировать налогообложение, чтобы раскрепостить действия предприятий при найме работников. Фонд социального обеспечения при этом должен формироваться не из абстрактного фонда заработной платы, а из доходов самих работников.

Если женщина выбирает большой арбуз **профессиональной деятельности** и стремится делать профессиональную карьеру, то и такой выбор должен поддерживаться *обществом и государством*. Общественное сознание должно освобождаться от стереотипов, не закрепляя должность за мужчиной и домашний фартук за женщиной. Понятно, что это самая трудная задача, не поддающаяся революционным изменениям. Но эволюционный прогресс в данном направлении должны демонстрировать в первую очередь общественные институты, претендующие на цивилизованность и демократичность. Пока ни одна партия, за исключением женской, не демонстрирует такой цивилизованности.

Многое в преодолении патриархальных стереотипов могут сделать *средства массовой информации*, настраивающие публику на многовариантность общественного поведения мужчин и женщин. По-своему хорошо выполняет данную задачу в передаче «Смак» известный музыкант Макаревич в домашнем фартуке.

Профессиональная карьера женщин не может строиться на искусственной основе квот и льгот. *Ни квоты* для женщин в государственном управлении (например, «не менее 30% аппарата управления должны быть женского пола») и политике, *ни особые льготы* для женщин-предпринимателей никогда *не приносят желаемых результатов*. Результат оказывается абсурдным. На ответственных должностях сидят не профессионалы, а интересные блондинки (или брюнетки — по вкусу) со связями. Покровительство для женского бизнеса выливается в его уничтожение. Бизнес регулируется не протекциями, а свободной игрой рыночных сил, конкуренцией. Что требуется от государства в данной связи — это обеспечение прозрачности рыночной и политической сфер.

Проблемы не только женские

Сведение **женских проблем** к *проблемам женщин* свидетельствует не только о непонимании сложности и взрывоопасности данного комплекса отношений, но и о намеренном неучастии государства и общественных институтов в разрешении множества конфликтов. От женского вопроса отпихиваются, понимая его значимость, загоняют в резервацию женских журналов, не желая связывать его с трансформацией экономики и общества. Камень трансформации не только не пытаются сдвинуть с места, к нему добавляют все больше тяжеловесных, абсурдных идей и действий.

Первые, кто не выдерживает этой тяжести, — женщины.

Саммит

Дом, в который Беларусь не пускают

Сегодня в Страсбурге открывается двухдневная встреча глав государств и правительств 40 стран — членов Совета Европы. Президента Беларуси на саммит не пригласили.

Накануне второй встречи глав государств — членов Совета Европы нелишне вспомнить историю этого старейшего и крупнейшего общеевропейского института.

За 48 лет своего существования Совет Европы (СЕ) не только расширился за счет приема новых членов (сегодня их 40, то есть практически здесь собрался весь континент), но и оброс легендами. Одна из них гласит, что когда в 1949 году западноевропейские государства решили создать организацию, отстаивающую демократические и гуманитарные ценности и главную из них — права человека, тогдашний британский министр иностранных дел, поморщившись, предложил найти для нее такое место, которое хоть и находится в центре Европы, но труднодоступно. В результате СЕ поселился в Страсбурге, как нельзя лучше отвечавшем критериям британского дипломата. Город расположен куда восточнее Лондона и Парижа и прижимается к границам сразу трех государств — родной Франции, бывшей родной Германии и нейтральной Швейцарии. Он стоит в стороне от железнодорожных и автомобильных магистралей: человеку, желающему заехать в Страсбург, всегда приходится делать крюк.

Авиация приблизила столицу Эльзаса к европейским центрам, но сам Совет Европы долгое время оставался «политической провинцией», пока его не посетил в 1990 году искавший престижную европейскую трибуну Горбачев. Именно с его речи в Совете Европы началось возрождение организации, вспомнившей об отсутствии в ее уставе каких либо ограничений на прием новых стран. Оставалась самая «малость» — подтянуть молодые демократии, появившиеся после падения Берлинской стены и распада СССР, до западных стандартов. Этой работой и занялся Совет.

Он довольно быстро принял вступительные экзамены в «клуб безупречных демократий» (определение председателя ПАСЕ Лени Фишер) у самых прилежных восточноевропейских учеников — Чехии, Венгрии, Польши. Тогда-то, в 1993 году, в Вене состоялся первый саммит СЕ, на котором были представлены уже 32 государства. Организация начала подавать признаки жизни, но для полной реанимации надо было определиться с «трудновоспитуемыми» кандидатами, прежде всего с осколками советской империи. Выбор был столь же очевиден, сколь и не прост: либо расширяться любой ценой и перестать так тщательно следить за соблюдением норм западной демократии, либо хранить верность «евростандартам», рискуя остаться политической периферией. Венский саммит высказался за первый вариант, а голоса сомневающихся заглушил посткоммунистический оптимизм.

В отличие от *NATO* и Евросоюза, погрязших в подготовительных геополитических и геоэкономических дискуссиях, СЕ «выполнил пятилетку в четыре года», и нынешняя Страсбургская встреча с участием уже 40 стран-членов будет по существу первым саммитом первой европейской организации, которой теперь практически некуда расширяться. Правда, к лику европейских демократий пока не причислены пять вставших в очередь на вступление государств (Азербайджан, Армения, Беларусь, Босния и Герцеговина и Грузия), да еще бывшая Югославия, которая и заявки не подавала.

Несмотря на исторический характер предстоящего саммита, в Страсбурге предпочитают воздерживаться от триумфальных интонаций. Из опыта «четырехлетней войны за демократию» стало ясно, что в Страсбурге не всегда есть готовые рецепты решения проблем бывших коммунистических стран. В кулуарах Дворца Европы, где заседает Совет, «несчастным случаем» называют прием Албании: за короткое время государство, вступившее в организацию раньше России, оказалось по сути без государства, то есть без той структуры, которую и предполагалось поднять до западноевропейских демократических стандартов.

Не легче с Боснией и Герцеговиной. Военная подготовка ее лидеров оказалась настолько выше демократической, что сейчас невозможно представить, каким образом там может действовать Европейская конвенция по правам человека, обязательная для любого государства — члена СЕ. В Сараево пока не знают, как выполнить в полном объеме Дейтонские соглашения по мирному урегулированию, и куда уж там до последних достижений «демократической мысли» — проблем клонирования или гуманного обращения с заключенными в тюрьмах.

А спешно принятую в СЕ Хорватию «сдали» даже ее покровители: на последней, сентябрьской, сессии ПАСЕ Госдепартамент США распространил среди депутатов записку, в которой просто-напросто предлагает отлучить Загреб от «безупречных демократий» за систематические нарушения прав человека. Американское вмешательство в дела суверенной европейской организации вызвало, конечно же, бурю негодования среди европарламентариев, но от обсуждения этого вопроса все равно не уйти.

Впрочем, встреча, подобная страсбургской, — не место для споров и выяснения отношений. Да и, похоже, главы государств и правительств собираются в Страсбурге скорее для двусторонних контактов, тем более что тексты обоих документов — Заключительной декларации и Плана действий — уже согласованы, что называется, «по дипломатическим каналам». Что касается самого Совета Европы, то для него практическим результатом саммита станет окончательный переход из разряда «политической провинции» в статус одной из столиц европейской политики. Это и зафиксирует традиционное «семейное фото на память» 40 лидеров европейских демократий перед Дворцом Европы.

Дмитрий САБОВ, Виталий ДЫМАРСКИЙ

«Итоги»

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Тэрарысты забіваюць

Іран

У Багдадзе неспакойна. У суботу чацвёра тэрарыстаў абстралялі і закідалі гранатамі будынак, у якім месціцца прадстаўніцтва ААН у сталіцы Ірака. Напад адбыўся ўвечары, калі офіс прадстаўніцтва ўжо зачыніўся і ў будынку заставаліся толькі ахоўнікі. Ад нападу пацярпела таксама штаб-кватэра Сусветнай арганізацыі здароўя, якая знаходзіцца ў ААНаўскім будынку і назірае за выкананнем праграмы «Нафта ў абмен на харчаванне і лекі». Адзін тэрарыст паранены і арыштаваны, астатнія зніклі.

Іракскія ўлады абвінавачваюць у гэтым інцыдэнце Іран. Дзве суседнія ісламскія краіны ўжо ваявалі паміж сабой з 1980 па 1988 гг. і застаюцца найзлейшымі ворагамі і сёння. Ва ўсякім разе, Іракскае інфармацыйнае агенцтва паведаміла, што на допыце затрыманы тэрарыст паказаў, што ён разам з астатнімі выканаў заданне іранскіх спецслужбаў.

Гэты хлопчык застаўся сіратою: ягоных бацькоў забілі фундаменталісты.

Алжыр

Увесь мінулы тыдзень быў трывожны і — трагічны. Мясцовыя ісламскія фундаменталісты забівалі дзяцей, старых, жанчын. Усе намаганні прэзідэнта краіны Л.Зеруаля дамагчыся спынення актаў насілля і заклікаць апазіцыю да мірных перамоваў так і не мелі поспеху. На мінулым тыдні ахвярамі ісламісцкага тэрору сталі больш за 200 чалавек.

Калумбія

У гэтай лацінаамерыканскай краіне тэрарыстычная рэвалюцыйная армія абвясціла вайну ўраду краіны. У 93 мілях на ўсход ад сталіцы, горада Багата, тэрарысты ўчынілі дэманстратыўны налёт. Знішчаны афіцыйныя будынкі і дамы сялян, ахвярамі сталі 15 мірных жыхароў.

6 кастрычніка прэзідэнт Эрнэста Сампер склікаў «ваенны савет», у які ўваходзяць высокія чыноўнікі службаў бяспекі краіны. Прычынай стала забойства 28-мі паліцэйскіх, салдат і супрацоўнікаў юрыдычных органаў на працягу 24-х гадзін. Адказнасць за падзеі кладзецца на левых і правых экстрэмістаў.

За апошнія паўгода гэта другі інцыдэнт такога маштабу: у сярэдзіне чэрвеня на паўночным захадзе Калумбіі 30 салдат загінулі ў баі з паўстанцамі-марксістамі, якія фактычна кантралююць 40% тэрыторыі, маючы каля 15.000 байцоў. За апошнія 10 гадоў ахвярамі марксістаў у Калумбіі сталі 35.000 чалавек.

Калумбійскія марксісты часта тэрарызуюць мірных жыхароў: сяляне не маюць зброі і не могуць даць тэрарыстам адпору.

Ізраіль—Ліван

8 кастрычніка 4 ізраільскія салдаты загінулі і 7 параненыя ў сутычцы з баевікамі праіранскай групоўкі «Хэзбалах».

Як паведамляе служба бяспекі Ізраіля, напярэдадні гэтага здарэння яшчэ адзін ізраільскі салдат загінуў ад выбуху бомбы тэрарыстаў гэтай жа групоўкі. Тымчасам 2 выбухі бомбаў адбыліся ў паўднёвай частцы ізраільскай акупацыйнай зоны ў Ліване, дзе былі параненыя 4 салдаты і ліванскі паліцэйскі.

На здымках: Ясір Арафат (зверху) і Беньямін Нетаньягу.

Тым часам прэм'ер-міністр Ізраіля Беньямін Нетаньягу і лідэр Палестыны Ясір Арафат у сераду правялі сустрэчу. Гэта іх першае спатканне за апошнія восем месяцаў. Назіральнікі адзначаюць, што ніякага прынцыповага прагрэсу ва ўрэгуляванні араба-ізраільскага канфлікту дасягнуць не ўдалося.

Падрыхтавалі
Расціслаў ПЕРМЯКОЎ
Аляксей ДУНАЕЎСКІ

Злучаныя Штаты нарабілі кепскіх грошай

Афіцыйныя асобы ЗША паведамілі, што прыкладна 218 мільёнаў 50-доларавых купюр новага ўзору маюць сур'ёзныя дэфекты і не могуць быць выпушчаныя ў абарачэнне.

У прыватнасці, на многіх купюрах не прадрукаваліся належным чынам адна або некалькі канцэнтрычных ліній вакол партрэта прэзідэнта Гранта. Гэтыя тонкія лініі ўваходзяць у лік новых, раней не прымяняных сродкаў аховы банкнотаў ад падробак.

У міжнароднай прэсе пачалі з'яўляцца паведамленні, што ЗША намераныя выпусціць дэфектныя купюры ў міжнароднае абарачэнне (як вядома, дзве трэціх з больш як 400 мільярдаў наяўных долараў ходзяць па-за межамі Злучаных Штатаў). Аднак прадстаўнікі Федэральнай рэзервовай сістэмы (галоўнага банка ЗША) і Бюро па выпуску каштоўных папераў запэўнілі, што ніводная дэфектная купюра не трапіць у абарачэнне — ні ў краіне, ні за мяжой. А да вызначанага тэрміну — 27 кастрычніка — будзе надрукаваная дастатковая колькасць якасных банкнотаў.

Між тым назіральнікі выказваюць пэўны скептыцызм: згодна з афіцыйнымі паведамленнямі, амаль 60 мільёнаў дэфектных 50-доларавых купюр ужо адпраўленыя ў рэгіянальныя банкі, якія не маюць дастатковых тэхнічных магчымасцяў, каб аддзяліць усе «добрыя» грошы ад «кепскіх», таму не выключана, што дэфектныя банкноты ўсё ж трапяць у абарачэнне. Тым часам Федэральная рэзервовая сістэма распрацоўвае праект закупкі высокахуткаснага дэтэктара, які мог бы аналізаваць да 10.000 купюр у хвіліну — гэта, спадзяюцца спецыялісты, уратавала б сітуацыю.

Калі б урад ЗША раптам вырашыў не займацца распазнаваннем і аддзяленнем «кепскіх» купюр, а знішчыў увесь уже надрукаваны аб'ём і замяніў яго на новыя банкноты — гэта каштавала б амерыканскім падаткаплацельшчыкам каля 7,6 мільёна долараў. Памылкі друку могуць быць вельмі дарагімі.

USIA

Голад у краіне за сямю замкамі

Вось ужо тры гады, як Паўночнай Карэяй — адной з самых закрытых краінаў у свеце — кіруе Кім Чэн Ір, нашчадак першай у свеце камуністычнай дынастыі. Пазаўчора адбылася афіцыйная цырымонія абрання 55-гадовага Кім Чэн Іра на пост генеральнага сакратара Працоўнай партыі Карэі. Карэйскія газеты паведамлялі, што гэтай падзеі *«натхнёна радаваліся людзі і ўся прырода»*. Між тым ужо тры гады ў краіне пануе люты голад.

Прадстаўнікі ўладаў КНДР запэўніваюць, што ад голаду памёрла толькі каля 100 дзяцей. Аднак тым, хто знаёмы з рэальнай сітуацыяй у Паўночнай Карэі, гэтая лічба падаецца цынічна-здзеклівай. У мінулы аўторак газета *South China Morning Post*, якая лічыцца адной з найбольш дасведчаных у паўднёва-ўсходнеазіяцкім рэгіёне паведаміла, што ўжо больш за мільён чалавек памёрла ў КНДР ад голаду. Іншыя крыніцы прыводзяць лічбу ў 2 мільёны. Для 23-мільённай краіны гэта катастрафічна шмат. Паўночнакарэйскі дыпламат, што не так даўно папрасіў палітычнага сховішча на Захадзе, расказаў пра тое, што ў яконай крайнай масавай з'явай становіцца канібалізм.

Каб неяк змагацца з голадам, шматлікія заводы, што знаходзяцца па-за сталіцай, вырабляюць сурагатныя піражкі з галля і травы. Гэтыя піражкі напаўняюць страўнік, але ж не маюць ніякай спажыўнасці. Паўночнакарэйскія ўлады прымушаюць людзей збіраць водарасці, якія мора выносіць на бераг, — з гэтага хоць нейкі наедак.

Уся ежа размяркоўваецца цэнтралізавана і ў гарадах, і ў вёсках. Кожнаму карэйцу штомесяц вызначаюць памер ягонай «пайкі», і яна ўвесь час меншае. Між тым набліжаецца зіма, а з кожным днём харчовыя прыпасы катастрафічна зніжаюцца. Сёлета ў Паўночнай Карэі зноў неўраджай: сабрана толькі 2,3 мільёна тонаў збожжа — толькі трэць ад звычайнага ўраджаю.

Паўночная Карэя заўсёды залежыла ад фінансавай дапамогі краінаў камуністычнага блоку. Але пасля разбурэння Берлінскага муру, становішча краіны пачало хутка пагаршацца. Пагоршылася так, што ў 1995 годзе Паўночнай Карэі давялося ўпершыню звяртацца па дапамогу да іншых краінаў. Аднак рэжым, што існуе ў КНДР, — адзін з самых рэпрэсіўных і сакрэтных у свеце, і таму здаецца, што паўночнакарэйскі ўрад не хоча раскрыць сапраўдны маштаб голаду ў краіне і просіць у якасці дапамогі самы мінімум — каб толькі насельніцтва не паўмірала зусім. Нягледзячы на тое, што ў Пхеньяне пастаянна дзейнічае прадстаўніцтва Сусветнай харчовай праграмы ААН (СХП), здаецца немагчымым рэальна ацаніць, наколькі сур'ёзна Паўночная Карэя пакутуе ад голаду. Прадстаўнікі СХП увесь час адчуваюць, як іх апякаюць спецслужбы. Куды б ні прыехалі міжнародныя эксперты — іх сустракаюць ужо падрыхтаваныя людзі: пераапранутыя, падсілкаваныя.

Пачынаючы з 1995 года ААН даставіла і размеркавала ў Паўночнай Карэі 400 тысячаў тон харчоў. 16 супрацоўнікаў СХП павінны наглядаць, каб гэтыя харчы не пайшлі на патрэбы войска. А армія ў КНДР проста гіганцкая. З ліпеня СХП корміць усіх паўночнакарэйскіх дзяцей ва ўзросце да шасці з паловай гадоў — а іх 2.6 мільёна — два разы на дзень. Дарэчы, усе гэтыя дзеці абавязаныя наведваць дзіцячыя садкі, аднак рэальна ў садках бывае толькі каля 20% дзяцей — з-за сталага недаядання дзеці шмат хварэюць, а некаторыя проста не могуць трымацца на нагах. Многія дзеці нагадваюць сабою шкілеты, і выглядаюць яны зусім не на свой ўзрост: тым, каму на першы погляд 2 гады, на самой справе 4, тым, якія выглядаюць чатырохгадовымі, — 7.

Калі камуністычны рэжым КНДР не зменіць палітыку загатай самаізаляцыі і ваяўнічай агрэсіўнасці — перш за ўсё супраць Паўднёвай Карэі, — паўночнакарэйскую нацыю чакае проста фізічнае выміранне.

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

Расізм наадварот

У першы панядзелак кастрычніка, калі штогод пачынаецца восеньская сесія Вярхоўнага суда ЗША, усе дзевяць суддзяў апранулі свае чорныя мантыі. На гэты раз ім давядзецца — сярод 50 іншых справаў — разглядаць беспрэцэдэнтны судовы выпадак «расавага ўціску белых» у Амерыцы.

Адміністрацыя школ штата Нью-Джэрсі, праводзячы скарачэнне, вырашыла звольніць белага настаўніка, а не чорнага — каб дасягнуць *«большай расавай разнастайнасці»* сярод супрацоўнікаў.

Белая настаўніца Шэран Таксмэн ужо выйграла іск у судзе ніжэйшай інстанцыі, дзе сцвярджала, што стала ахвярай *«звароттай расавай дыскрымінацыі»*. Цяпер школьная рада падала апеляцыю, і Вярхоўны суд, як чакаецца, вынясе сваё рашэнне зімой гэтага года.

Адміністрацыя Клінтана першапачаткова прыняла бок чорнаскурага выкладчыка, але потым змяніла пазіцыю на карысць белай выкладчыцы. Між тым праваабарончая група Амерыканскі саюз абароны грамадзянскіх свабодаў просіць суд вынесці рашэнне аб тым, што зацікаўленасць у падтрыманні *«расавай разнастайнасці»* не супярэчыць закону.

Суд скажа сваё слова зімой. Назіральнікі прадказваюць, што рашэнне будзе на карысць белай настаўніцы — што выкліча ціхае задавальненне сярэдніх белых амерыканцаў і шумныя акцыі пратэсту «каляровых» — прычым не толькі чарнаскурых.

Магдалена НЕПАКАЙ

ТП «Виаполь» приглашает на осенних каникулах в экскурсионные туры:
— «Блистательный Санкт-Петербург»: $80 + 600000 руб.;
— «Старинный Краков. Божественный Ченстохов»: $100 + 900000 руб.
Тел. (017) 227-65-47
Лицензия МСТ № 361, 19.12.96 — 19.12.98

НЕ ДОРОГО!
ОБОРУДОВАНИЕ ДЛЯ ДИСКОТЕК

Акустическое оборудование:
Event 3000 RCF(Италия) 300/600W(RMS), 60..20000Hz±3dB
ESW1018 RCF(Италия) 600/1200W(RMS), 35..150Hz±3dB
Световое оборудование:
DISCOTECH
Пульт управления световыми приборами Диммера
Кратковременная эксплуатация
Хорошее состояние
Тел: (017) 210-02-53

Стеллажи и стойки
– торговые –
– экспозиционные –
– офисные –
для газет и журналов,
– для папок и бумаг
ПРОДАЖА ГОТОВЫХ ИЗДЕЛИЙ И ИЗГОТОВЛЕНИЕ ПО ИНДИВИДУАЛЬНЫМ ЗАКАЗАМ

Тел. (017) 210-02-53
факс 236-24-41

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
10 кастрычніка 1997 г., № 112

Усіх перамог Іванаў

Беларускія мытнікі і памежнікі сёлета таксама ўзялі чынны ўдзел у тэатральным фестывалі «Белая вежа», што днямі завяршыўся ў Брэсце.

Увесь склад украінскага спектакля «Войцак» (выключнае тэатральнае ўвасабленне апакаліпсісу Першай сусветнай вайны) меў шчасце высвятляць адносіны з мытнікамі амаль суткі перад паказам. Дэкарацыі літоўскай пастаноўкі «Іванаў» (адметная інтэрпрэтацыя Чэхава) паўсталі на сцэне недзе за паўтары гадзіны да пачатку спектакля. Нічога, віленскі «Вайдзілас» — тэатр малады, не раздураны, так што справіўся. І нават заваяваў гран-пры.

А ўвогуле «Белая вежа» сёлета ўзнялася над усялякімі памежнымі слупамі і мытнымі кардонамі. Менавіта літоўцы надалі ёй бляску вежы Эйфеля, а ўкраінцы — вастрыні падзення і палёту над безданню, як у вежы Пізанскай. Знакаміты літоўскі акцёр, вядомы рэжысёр, а цяпер і кіраўнік «Вайдзіласа» Альгіс Латэнас пракаментаваў берасцейскае тэатральнае спатканне — маўляў, невядома як улады, а творцы мецьмуць вока незапарушанае. Пэўна ж, не крывым і не чорным вокам зірнула на «Вайдзілас» і нашае міністэрства культуры — і не стрымалася, пачало перамовы пра вясновыя гастролі, ужо ў Мінску.

Фестываль у Брэсце — крыху незвычайны паводле арганізацыі. Ужо другі год запар «Белая вежа» збіраецца-складаецца з дапамогай міністэрства, але ж сіламі перадусім горада Брэста, ягоных прадпрыемстваў, фірмаў ды выканкамаў, а берасцейскі тэатр драмы і музыкі пускае на сваю сцэну.

Альгіс Латэнас зрабіў сабе імя як акцёр (на здымку ён у ролі Дон-Жуана). А цяпер — здабыў і рэжысёрскае гран-пры.

А яшчэ сёлета «Белая вежа» выдавала і на Вавілонскую, — я не пра тэхнічную якасць перакладу, скажам, венгерскага спектакля (а за трэскам апаратуры часам і акцёрам не было як дачуць). Я — пра агульную якасць афішы, якая збіралася, мякка кажучы, немэтанакіравана, выпадкова, хоць некаму гэтая стракатасць магла падацца эфектнай. Было ўсё — ад этнаграфічнага паказу ў натуральнай мангольскай юрце да монаспектакля з Кіпра, які па-свойму адметна вяртаў фестываль да старажытнагрэцкай традыцыі тэатральнага маўлення і прадстаўлення. Расійская мінуўшчына на чале з імператрыцай Кацярынай, прадстаўленая берасцейскім тэатрам драмы і музыкі ў спектаклі «Каханне — кніга залатая», больш выдавала на недарэчны кіч. Абсалютная, пралічаная, узважаная, вымераная адметнасць маскоўскага тэатра «Чорнае неба белае» і спектакля «Тут быў СССР» дэманстравала найсучасныя тэхналогіі — у тым ліку і ў тэатры. Акцёры валодалі сваёй тэхнікай адмыслова: жудасныя плоцевыя пераўтварэнні, мутацыі мозгу па-тэатральнаму вырашаліся праз музыку, святло і рух, абмалёўвалі шлях, да канца якога мы, магчыма, усёй былой звышдзяржавай не дайшлі... Зусім трошкі.

Лялечная праграма аніяк не суадносілася з праграмай драматычных спектакляў. Хоць менавіта ва ўзаемадачыненнях людзей ды лялек можна было б шукаць плёну «Белай вежы»: тэатр, бачыце, так цікава ўзнаўляецца напрыканцы тысячагоддзя, і, можа, неўзабаве мяжу паміж лялечным спектаклем і драматычным зможа вызначыць толькі спецыяліст?.. Зрэшты, мастацтву такія пераўтварэнні толькі на карысць.

На фоне ўласна вежы — Камянецкай — тэатр-лабараторыя нацыянальнай драматургіі «Вольная сцэна» паказваў Шэкспіраву трагедыю «Рычард» (заўважым, што ў гісторыі і ў англійскага драматурга гэты кароль вядомы як Рычард Трэці). Пад дожджычкам дробным. Пад ветрыкам халодным. Замяняючы Рычардам абяцанага князя Вітаўта (купалаўцы не спрамагліся паказаць свой спектакль). Кіраўнік «Вольнай сцэны» Валерый Мазынскі, прамаўляючы свае слова перад гледачамі, распавёў пра 545-годдзе Рычарда III гістарычнага — абцяжаранага ўсімі грахамі і злачынствамі, якія не абмінуў Шэкспір. Публіка пляскала ў ладкі да прадстаўлення, апладзіравала пасля. Не сцвярджаю, што разабралася, але ў фінале зло, пакараўшы зло, выглядала — амаль як дабро.

Тыран Рычард заступіў рэфарматара князя Вітаўта, але абодвух здужаў рэфлектыўны чэхаўскі інтэлігент Іванаў. Той, што прыехаў з Вільні. Той, што заплаціў за перамогу самым дарагім — жыццём... Але гэта ўразіла і кранула публіку нашмат мацней за халодныя страсці вакол каралеўскай улады.

Жана ЛАШКЕВІЧ

Вялікі мастак на маленькай выставе

У галерэі «Мастацтва» праходзіць выстава работ вядомага беларускага жывапісца Феліксa Янушкевіча.

У маленькай зале «Мастацтва» (яна займае адзін пакой памяшкання мастацкай крамы на пр.Скарыны, 12) цяжка размясціць шмат твораў, і звычайна тутэйшыя выставы ўяўляюць сабой нейкі тузін карцін ці гравюр, якія не выходзяць за межы аднаго цыклу або адной тэмы. Відаць, гэта задавальняе мастакоў, бо галерэя мае на мэце ў першую чаргу не канцэптуальную выставачную дзейнасць, а продаж работ.

Бадай, толькі Ф.Янушкевічу пакуль удалося паказаць сваю творчасць у сціплай галерэі «Мастацтва» не горш, чым у вялікім палацы. На ягонай маленькай выставе прыемна ўражвае разнастайнасць тэм і жанраў. Нават па памерах работы вельмі розныя — побач з буйнымі палотнамі — зусім маленькія, эскізных памераў карціны, і гэта, здаецца, надае своеасаблівы «выставачны» эфект, дадае экспазіцыі цікавасці.

Але, вядома, мастацкая вартасць выставы — у саміх творах Фелікса Янушкевіча, даўно прызнанага майстра, аднаго з выбітных жывапісцаў Беларусі. Мяркуючы па прадстаўленых карцінах, Ф.Янушкевіча не абмінула ўласцівае многім ягоным калегам захапленне сімваламі — выявы прадметаў набываюць у яго шматзначнасць, прымаюць на сябе ролю знакаў глыбокага сэнсу. Напрыклад, «Нацюрморт Вольных Муляраў», на першы погляд, — проста прыгожае спалучэнне прадметаў, якія, аднак, сімвалізуюць загадкі таямнічай магутнай арганізацыі...

Цікава бачыць такія з'явы ў творчасці мастака, які ў мінулым дзесяцігоддзі праславіўся партрэтамі гістарычных дзеячоў Беларусі: тады ён надаваў адочнасць ідэям нашай культурнай гісторыі, цяпер —наадварот, надзяляе высокай духоўнасцю звычайныя краявіды і нават прадметы (на гэтым прынцыпе пабудаваныя карціны «Успамін», «Сёмуха», «Святая крыніца»).

Дзве работы на выставе Ф.Янушкевіча — прысвячэнні М.Селяшчуку — пабудаваныя «ў стылі» афортаў Рэмбрандта, чыя творчасць лічыцца, бадай, самай глыбокай па духоўнасці ва ўсёй гісторыі мастацтва. Зварот да Рэмбрандта ў творах, прысвечаных памяці сябра, — гэта таксама сімвал. Увогуле, мова сімвалаў, якой карыстаецца Янушкевіч, лёгка зразумелая і пры гэтым пазбаўленая непрыемнай вычварнасці, характэрнай для многіх нашых «сімвалістаў». У адрозненне ад іх, Янушкевіч мае не толькі дар жывапісца, але і добры густ, і выдатную адукацыю. Ягоная выстава, хаця і зусім маленькая, дае і радасць вачам, і работу душы і розуму. А працаваць яна будзе да 20 кастрычніка.

Ганна ШЫМЕЛЕВІЧ

АФІША

Барыс Луцэнка прымае віншаванні

У Рускім тэатры працягваецца Тыдзень спектакляў Барыса Луцэнкі. Сёння, 10 кастрычніка, можна паглядзець адну з самых папулярных работ рэжысёра-юбіляра — «Амфітрыён», дасціпную імпрэзу паводле класічнага грэцкага міфа. 11 кастрычніка пройдзе трагедыя паводле Д.Мярэжкоўскага «Хрыстос і Антыхрыст», а 12-га пакажуць містэрыю С.Бельцюкова і А.Залётнева «Благаславі нас, Божа», якая, дарэчы, ідзе апошнім часам даволі рэдка. 12 кастрычніка ў публікі таксама будзе магчымасць прыняць удзел у даволі незвычайным спектаклі «Перпетуум мобіле, або Вечар габрэйскага анекдота», які пачнецца ў 19:30 на Малой сцэне Рускага тэатра. Завершацца святы ў гонар народнага артыста Беларусі Барыса Луцэнкі юбілейнай вечарынай 14 кастрычніка. Як паведамілі ў тэатры, на гэты дзень квіткі не прадаюцца — на ўсе 500 месцаў залы прэтэндуюць сябры і калегі рэжысёра, якія прыйдуць да яго з віншаваннямі. Аднак плануецца, што юбілей будзе здымаць Беларускае тэлебачанне, каб потым паказаць тэатральнае свята ўсёй краіне.

Тэатр імя Янкі Купалы на наступным тыдні прапануе паглядзець шэраг вельмі розных імпрэзаў, якія, аднак, усе адносяцца да аднаго жанру — камедыі. 10 кастрычніка пройдзе «Паўлінка», 11-га — «Ромул Вялікі», 12 і 13 кастрычніка — «Тутэйшыя», 15 і 16 — «Таполевая завея». У тэатры «Вольная сцэна» пакажуць 10-га «Паваліўся нехта», 11-га — «Узлёт Артура Уі...», 12-га — «Містэр Розыгрыш», 14-га — «Рычард», 16-га — «Шампань-скага!». Два спектаклі плануе паказаць у бліжэйшыя дні Тэатр-студыя кінаакцёра — «Таланты и поклонники» (10, 11 і 12 кастрычніка) і «Выкраданне Елены» (15 і 16 кастрычніка). Тэатр «Дзе-Я?» запрашае да сябе дарослых 10, 11 і 12 кастрычніка паглядзець гогалеўскую «Жаніцьбу», а таксама дзяцей — на казачную імпрэзу «Барановы кароль», 11 і 12 кастрычніка а 12-й гадзіне.

Тэатр оперы і балета 10 кастрычніка запрашае на класічны балет «Жызэль», 11-га тут пройдзе опера «Яўген Анегін», 12-га раніцай — балет «Бахчысарайскі фантан», увечары — опера «Кармэн». 14 кастрычніка прагучыць славутая опера «Севільскі цырульнік», 15-га пакажуць «Лебядзінае возера», 16-га — «Баль-маскарад», таксама класічная опера. Як бачым, парытэт паміж операй і балетам у гэтым тэатры захоўваюць вельмі строга.

А ў іншым музычным тэатры Мінска — Тэатры музычнай камедыі — ідуць спектаклі розных жанраў. 10 кастрычніка тут адбудзецца вечар балета, які складаецца з кароткай «Шахеразады» на музыку Рымскага-Корсакава і «Іспанскага дывертысмента», у якім гучаць народныя іспанскія мелодыі. 11 кастрычніка пройдзе аперэта «Капялюш Напалеона», 12-га раніцай — дзіцячы мюзікл «Залатое кураня», увечары — аперэта «Вясёлая ўдава». 15-га тут можна паглядзець аперэту «Цыганскі барон», 16-га — «Жанчыну-кажана».

КАНЦЭРТЫ

10 кастрычніка ў Канцэртнай зале філармоніі прагучаць творы Р.Вагнера ў выкананні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі. 11 кастрычніка аматарам класікі можна будзе выбраць з дзвюх альтэрнатыў: у Зале камернай музыкі будзе выступаць Л.Чарняк (домра) з праграмай твораў кампазітараў-класікаў, і ў гэты ж дзень у Чырвоным касцёле дасць канцэрт Мінскі сімфанічны аркестр *Collegium Musicum* (пачатак а 19-й гадзіне, квіткі каштуюць 30—100 тысяч рублёў).

Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга 12 кастрычніка будзе выступаць у Канцэртнай зале філармоніі з вялікай праграмай музыкі ў стылях джаз, поп, фанк, ф'южн, рок. Вечарына прысвячаецца салісту аркестра, гітарысту С.Анцішыну.

16 кастрычніка ў вялікай філарманічнай зале выступяць сапраўдныя амерыканскія музыкі з сапраўднай негрыцянскай музыкай: гурт *The Johnny Thompson Singers* з Філадэльфіі (ЗША) прадставіць мінчукам спірычуэлс — класічную форму джаза, якая нарадзілася калісьці з негрыцянскіх царкоўных спеваў. Квіткі на гэты канцэрт прадаюцца за 150—250 тысяч рублёў.

Таксама 16 кастрычніка адбудзецца канцэрт ансамбля салістаў «Класік-авангард» у Зале камернай музыкі. У праграме — Шуберт, Моцарт, Гайдн, творы сучасных кампазітараў.

Ганна ШЫМЕЛЕВІЧ

Нашая народная кніга

Васіль БЫКАЎ. Сцяна

З ласкавае згоды народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава выдавецтва «Наша Ніва» распачынае выданне новага зборніка прозы В.Быкава «Сцяна» — кнігі, якая рыхтавалася да выхаду ў дзяржаўным выдавецтве, але сёння рэжым спыніў гэтую працу. Паміж творамі народнага пісьменніка Васіля Быкава і чытачом не павінны паўставаць бар'еры. Кнігі лепшых беларускіх літаратараў будуць выходзіць, дакуль яны маюць чытачоў.

Вось ідэяй стварыць Народную Кнігу мы сцвердзім, што беларускія кнігі выходзяць дзеля патрэбаў і за грошы беларусаў. Кніга «Сцяна» складаецца з празаічных твораў Васіля Быкава апошніх гадоў, яе аб'ём — 17 аркушаў. Мяркуецца, што яна выйдзе ў свет у канцы кастрычніка — пачатку лістапада сёлета.

Каб падпісацца на «Сцяну», трэба 68.000 руб. (кошт выдання) + 20.000 руб. (паштовыя выдаткі) пералічыць на рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поиск» г.Мінска, код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сектары «Для пісьмовага паведамлення» ўказаць назву кнігі, Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсць, тэлефон.

Нагадаем, што той, хто падпісваецца на кнігі «НН» да іх выхаду ў свет, аплочвае толькі сабекошт і кошт перасылкі, тады як гатовая кніга з усімі гандлёвымі нацэнкамі будзе каштаваць значна даражэй.

Выдавецкая група БГФ «Наша Ніва»

ПАМЯЦЬ

Міхась Раманюк памёр 4 верасня, і ў наступны аўторак — сарачыны. Будзе 40 дзён, як ён пайшоў з жыцця. Міхась Раманюк нарадзіўся ў 1944 г. у вёсцы Кавалі на Брагіншчыне. Вучыўся з дзецьмі, нашмат старэйшымі за яго, але там, на Палессі, школы так і не скончыў. Прыехаў у Мінск і неяк — праўдай ці няпраўдай — паступіў у тэхнікум, а атэстат аб сярэдняй адукацыі здабываў у вечаровай школе. А пасля ўжо быў тэатральна-мастацкі інстытут і з трэцяга курса — вандроўкі па ўсёй Беларусі.

А ў вандроўках захапіўся беларускім народным касцюмам —замалёўкі, чарцяжы, фатаграфіі, калекцыі. І пасля — славуты альбом і выставы ў Еўропе. А яшчэ — кераміка, прасніцы, калаўроты...

Ён усё жыццё вывучаў традыцыйны беларускі касцюм — і ствараў сучасны: для народнага хора імя Жыновіча, для самадзейных калектываў, для фільма «Людзі на балоце». Ён ведаў гэтую справу.

Ён не дажыў да выдання ўсіх сваіх кніжак, але сёлета быў першы выпуск вышэйшай школы мастацтвазнаўца — ягоных вучняў.

Людміла ЧАПРОЎСКАЯ

На здымку: адна з экспедыцый Міхася Раманюка была прысвечаная пахавальным абрадам беларусаў і вывучэнню магільных крыжоў.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ПАНЯДЗЕЛАК 13 КАСТРЫЧНІКА

БТ

7.30 Утренний коктейль. 7.45, 17.55 «Музыкальная обойма». 7.50 «Очарованные». Д/ф. 8.00 Резонанс. 8.45 «Телебарометр». 8.55 Здоровье. 9.30, 17.45 Экономикст. 9.40 Мультфильмы. 10.05 Темная комната. 10.30 Телевизионный Дом кино. 11.00 «Только в мюзик-холле». Х/ф. 12.05 Зеркало. 12.25 Бон тон. 13.00, 15.00, 18.00, 0.05 Новости. 15.15 Видеокурс немецкого языка. 15.45 ТВ – школе. 16.15 На добрый лад. 16.30 Гости в дом. 17.00 Музыкальный антракт. 17.10 Параграф. 18.15 «Только в мюзик-холле». Х/ф. 19.20 Тема дня. 19.40 «Землю не обманешь...» 20.00 Криминальная хроника. 20.20 «Кто это?» 20.25 Музыкальный антракт. 20.40 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.50 «Запоханный апостол». Фильм-спектакль. 23.35 Концертный сезон.

ОРТ

